Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

DOI:10.17951/sb.2015.9.149
Studia Białorutenistyczne 9/2015 Literaturoznawstwo

Ірына Багдановіч

Białoruski Uniwersytet Państwowy (Mińsk, Białoruś)
Belarusian State University (Minsk, Belarus)

E-mail: ibogdana@yandex.ru

Польскамоўны верш *Krakow* Адэлі з Устроні як „ключ" да разгадкі аўтарства паэмы *Мачаха*

Polskojęzyczny wiersz Kraków *Adeli z Ustronia jako klucz do ustalenia autorstwa poematu* Macocha

Polish poem Krakow *by Adelie of Ustron as a „key" to the authorship of the poem* The Stepmother

Уводныя заўвагі

Досыць невялікі, але тым не менш вельмі прадстаўнічы ў персаналіях і багаты на сродкі мастацкай выразнасці корпус беларускамоўных твораў XIX стагоддзя чаруе і дагэтуль сваёй загадкавасцю, магчымасцю адкрыццяў і новага бачання вядомых фактаў. У гэтым корпусе твораў нашу ўвагу даўно ўжо прывабіла адна з тагачасных пярлінаў ананімнай паэзіі – невялічкая паэма *Мачаха*, аўтарства якой прыпісваецца невядомай беларускай пяснярцы сярэдзіны XIX ст., схаванай за псеўданімам Адэля з Устроні. Твор, як вядома, быў знойдзены ў рукапісных сховішчах Кракаўскай Ягелонскай бібліятэкі знакамітым беларускім вучоным Адамам Мальдзісам яшчэ ў самым пачатку 1970-х гг., скапіраваны ім і прывезены ў Беларусь. Даследчык падрабязна апісаў свой архіўны пошук і яго вынікі, а таксама апублікаваў фрагменты твора ў вядомым артыкуле *Тры месяцы пошукаў, знаходак і сустрэч*[1]. А цалкам твор упершыню пабачыў свет у літаратурным зборніку *Краю мой – Нёман. Гродзеншчына літаратурная* ў 1986 годзе[2]. Факт гэтай публікацыі тлумачыцца тым, што дзеянне твора адбываецца на рацэ Нёман, да таго ж месца яго ўзнікнення ідэнтыфікуецца як населены пункт

[1] A. Maldzis, *Try miesiacy poszukau, znachodak i sustrecz,* „Połymia" 1973, nr 7, s. 202–240.

[2] *Kraju moj – Nioman. Grodzieńszczyna litaraturnaja,* red. D. Biczel-Zahnietawa, Minsk 1986, s. 238–242.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

Устронь, які меўся ў Лідскім павеце і адкуль, магчыма, была родам невядомая аўтарка. Прынамсі такі каментар дадаваў даследчык пры публікацыі паэмы, адзначаючы пры гэтым высокі ўзровень таленту аўтара, які можна параўнаць з талентам Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. У 1988 годзе твор увайшоў у вядомую хрэстаматыю *Беларуская літаратура XIX стагоддзя* для вышэйшых навучальных устаноў (складальнікі А. А. Лойка і В. П. Рагойша)[3], і з таго часу паэма *Мачаха* нязменна ўпрыгожвае ўсе пачарговыя выданні анталогій і хрэстаматый па беларускай літаратуры дадзенага перыяду, рэпрэзентуючы рамантычны напрамак у ёй і дадаючы таямнічага каларыту загадкавасцю псеўданіма свайго аўтара.

Высокія мастацкія вартасці гэтага твора, яго алегарычнасць, пафас „літвінскага" патрыятызму, рамантычная паэтыка з адмысловым ужываннем фальклорных прыёмаў пастаянна прыцягвалі нашу ўвагу, скіроўвалі да мэтанакіраваных навуковых пошукаў. Паступова – на аснове супастаўлення вядомых нам матэрыялаў і вывучэння даступных на той момант крыніц – намі была высунута і абгрунтавана навуковая гіпотэза адносна таго, хто можа быць рэальна схаваны за псеўданімам Адэля з Устроні. Усе факты складваліся ў лагічную і навукова абгрунтаваную карціну, выснова якой напрошвалася сама сабой: адзінай пісьменніцай сярэдзіны XIX стагоддзя, якой можна атрыбутаваць аўтарства паэмы *Мачаха* і чый талент не меншы за талент Дуніна-Марцінкевіча, прэтэндуе быць Габрыэля з Гюнтэраў Пузыня! У некалькіх навуковых артыкулах, апублікаваных на працягу 2006–2012 гг., намі было зроблена паслядоўнае і лагічнае абгрунтаванне гэтай гіпотэзы на аснове шэрагу пераканаўчых аргументаў[4].

Наша меркаванне і аргументацыя былі таксама з зацікаўленнем і разуменнем успрынятыя А. Мальдзісам, які змясціў інтэрв'ю з аўтарам гэтых радкоў пад тытулам *Загадка аднаго рукапіснага твора: Навуковец Ірына Багдановіч лічыць, што паэму Мачаха магла напісаць графіня Габрыэля Гюнтэр*, дзе былі прагавораны ключавыя палемічныя моманты дадзенай атрыбуцыі, у прыватнасці тое, што Дабраўляны – маёнтак бацькі, дзе жыла ў той час Габрыэля, знаходзіцца досыць далёка ад Нёмана[5]. Чаму ж сталася магчымай і несупярэчлівай, з нашага пункту гледжання, такая атрыбуцыя? Падсумуем коратка нашы ранейшыя высновы па гэтым пытанні.

[3] *Biełaruskaja litaratura XIX stahoddzia: Chrestamatyja,* red. A. Łojka, W. Rahojsza, Minsk 1988, s. 73–74.

[4] I. Bahdanowicz, *Zahadka Adeli z Ustroni*, „Pracy Kafiedry historyji biełaruskaje litaratury Biełdziarżuniwiersiteta" 2006, t. 7, s. 52–62; I. Bahdanowicz, *Adela ci Gabryela: sproba razhadki autarstwa paemy „Maczacha",* „Rodnaje słowa" 2007, nr 10, s. 14–18.

[5] A. Maldzis, *Zahadka adnago rukapisnaha twora,* „Hołas Radzimy" 2010, 16 wierasnia.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

Чаму графіня Габрыэля Гюнтэр можа быць Адэляй з Устроні? Першы этап: развагі пра тэкст і кантэкст

Ключом да разгадкі аўтарства паэмы *Мачаха* для нас паслужыў польскамоўны верш *Krakow*, змешчаны ў тым жа рукапісным сшытку, што і паэма *Мачаха* і перапісаны тым самым почыркам. Менавіта пад гэтым вершам, як пазней высветлілася, а значыць, у канцы ўсяго рукапісу, стаяў подпіс „Adela. Litwa. 1850. Ustronie” („Адэля. Літва. 1850. Устроне”). Тое, што ў адным канвалюце змяшчаліся два вершы – беларускамоўны і польскамоўны – наводзіў на думку, што аўтара варта шукаць сярод тагачасных прафесійных польскамоўных пісьменнікаў нашага краю, якія вызнавалі мясцовы, так званы „літвінскі”, патрыятызм і літаратурным кумірам якіх быў Адам Міцкевіч, у чыіх творах Нёман набыў статус патрыятычнага сімвала. Правільнасць хода нашай думкі падцвярджалі польскія формы і націскі некаторых слоў, ужытых у паэме *Мачаха* („Стаяла – як *бледа слонца*”, „А бура над *рэкай* стала”, „Цераз *Немэн*” і інш).

Чаму мы лічым, што аўтарам паэмы *Мачаха* магла быць менавіта графіня Габрыэля Гюнтар (у 1850 яна яшчэ не была Пузынінай)? Сярод тагачасных польскамоўных паэтак Беларусі менавіта яна і ніхто іншы мае ўсе падставы на гэта прэтэндаваць. Па-першае, адпавядае яе ўзрост і літаратурная вядомасць. Яна нарадзілася ў Вільні ў 1815 г., і на час, якім датаваны рукапіс, была спрактыкаванай польскамоўнай пісьменніцай, аўтаркай некалькіх паэтычных кніг: ў 1843 г. у Вільні з друку выйшаў яе першы паэтычны зборнік *W imie Boże (У імя Божае),* а ў 1845 г. – другі *Dalej w świat! (Далей у свет!*). Такім чынам, у 1850 г. гэта была ўжо досыць вядомая і вопытная паэтка, талент якой можна параўноўваць з паэтычным майстэрствам аўтара паэмы *Мачаха*.

Другі аргумент, высунуты намі, быў звязаны з культурным акружэннем Габрыэлі, у якім панавалі ідэі „літвінскага” патрыятызму. Сярод гасцей сям’і Гюнтэраў у графскім палацы ў Дабраўлянах, а таксама ў Вільні, куды перабіраліся на зіму, частымі гасцямі былі колішнія філаматы: Ян Чачот, Тамаш Зан (гасцяваў у Гюнтэраў праз увесь канец зімы 1842 г.), Антоні Эдвард Адынец, а таксама Ігнат Ходзька (менавіта ён адрэдагаваў і давёў да друку яе першы паэтычны зборнік), Уладзіслаў Сыракомля ды іншыя дзеячы культуры і асветы краю, погляды якіх вызначаліся выразным „краёвым” патрыятызмам. У такой атмасферы, злучанай з уласнымі сімпатыямі да вуснай народнай творчасці і жыцця простага люду, Габрыэля натуральна магла схіліцца да паэтычнага эксперыменту на беларускай мове.

Па-трэцяе, мы вытлумачылі ў ранейшых публікацыях, як звязваецца з Габрыэляй і месцам яе жыхарства назва Устроне і Нёман. Слова „ustronie” ў перакладзе з польскай мовы азначае „зацішны куток”, аддаленае ад пышных сталіц месца. Гэтае слова досыць часта ўжываецца ў літаратуры менавіта ў такім значэнні, сустракаецца яно і ў вершах Габрыэлі. Заўважым яшчэ раз, што ў рукапісу ўжыта менавіта слова „Ustronie”, а не „Ustroń”. Такім чынам, месца напісання твораў (*Мача-*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

ха і *Krakow*) фактычна прачытваецца як „Літва… Зацішны куток". Такім, далёкім ад Кракава, кутком – „устронню" – маглі быць тыя ж самыя Дабраўляны.

У якасці чацвёртага аргумента мы звярталі ўвагу на самую творчасць Габрыэлі Пузыні на польскай мове. Яна шматгранная і дастаткова вытанчаная ў фармальна-мастацкіх адносінах. Нямала вершаў яе прысвечана тэме сіроцтва, сустракаецца і вобраз мачахі, праўда, пададзены ў пазітыўнай абмалёўцы, што грунтавалася на жыццёвых назіраннях і кардынальна пярэчыла фальклорнаму канону.

Што датычыць літвінскага „краёвага" патрыятызму, то ён быў уласцівасцю свядомасці самой аўтаркі, паходзіў з сям'і, з выхавання, і быў шчодра разліты ва ўсёй яе творчасці. Дастаткова назваць такія красамоўныя творы, як верш *Да Адама Міцкевіча (пасылаючы яму трохі вады і кветак*), апавяданне *Помста Літвінкі* ды інш., не кажучы ўжо пра шырокавядомыя ўспаміны *У Вільні і літоўскіх дварах*. Неаднойчы, напрыклад, у згаданым вершы яна звяртаецца да адрасата, называючы яго „Litwinie", згадвае легендарны Нёман – сімвал радзімы, падкрэслівае і сваё літвінскае паходжанне, зямляцтва з паэтам, якое дае ёй права звяртацца да яго: „Я, Ліцвінка, да цябе спяваю, // Бо зямляцтва мне дае адвагу"[6].

Гэта быў першы этап у распрацоўцы нашай навуковай гіпотэзы адносна атрыбуцыі паэмы *Мачаха*. Усе прыведзеныя аргументы нам бачыліся дастаткова пераканаўчымі для таго, каб лічыць Габрыэлю Гюнтар той польскамоўнай мясцовай (літвінска-беларускай) аўтаркай, якая магла напісаць на аснове фальклорных матываў і народна-песеннай паэтыкі ўласны беларускі твор. Далейшы этап даследаванняў не разбураў высунутай версіі, але дадаваў да яе новыя красамоўныя сведчанні.

Другі этап: знаёмства з рукапісам

Гэты этап быў звязаны з неабходнасцю, нарэшце, непасрэдна пазнаёміцца з самім рукапісам паэмы і вершам *Кракаў*, пра які толькі згадвалася ў публікацыях А. Мальдзіса. У свой час Адам Язэпавіч ласкава дазволіў нам зазірнуць у яго архіўныя выпіскі, звязаныя з паэмай, і мы змагла пераканацца, што верш *Кракаў* застаўся па-за ўвагай даследчыка, што было цалкам натуральным у 1970-я гг. Трэба было ехаць у Кракаў, каб самой паглядзець легендарны рукапіс. І вось, нарэшце, ён перад намі – той самы тонкі сшытак з акуратна перапісанымі тэкстамі *Мачахі* і *Кракава*. Дробны імклівы характар почырку спакусіў думкай, што гэта можа быць аўтограф самой Габрыэлі, і тады, як нам здавалася, пытанне аўтарства вырашалася аўтаматычна (што, дарэчы, як аказалася, зусім не факт!). У нас мелася некалькі копій яе лістоў, таму па вяртанні з Кракава мы звязаліся з аўтарытэтным графолагам, каб падцвердзіць сваю думку. На жаль, нас чакала расчараванне: ру-

[6] *Rasa niabiosau na ziamli tutejszaj: Biełaruskaja polskamounaja paezija XIX stahoddzia,* red. U. Marchel, Minsk 1998, s. 431.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

капіс – не аўтограф Габрыэлі! Больш за тое, характар почырку, на думку эксперта, быў выразна „мужчынскі"!

Вынікі гэтага этапа даследавання былі агучаны намі ў 2010 г. на Пятым Міжнародным кангрэсе беларусістаў у Мінску і апублікаваны ў матэрыялах Кангрэса[7]. Між іншым, мы звярталі ўвагу і на тое, што меркаванне эксперта-графолага, па-сутнасці, не разбурала высунутай намі версіі: рукапіс уяўляў сабой белавы аўтограф, а перапісчыкам не абавязкова выступаў сам аўтар! У XIX ст. звычайнай была практыка як уласнаручнага, так і няўласнаручнага перапісвання твораў. Таму ўстанаўленне таго, чый гэта аўтограф, яшчэ не з'яўляецца прамым доказам аўтарства, хаця і вельмі правакуе на гэта.

Другое, што здавалася найбольш важным, – сам верш *Кракаў*. Нават беглае знаёмства з гэтым польскамоўным тэкстам, які дагэтуль не быў нікім апісаны і даследаваны, прывяло нас да наступнага назірання: Адэля з Устроні як лірычная гераіня і наратарка верша *Кракаў*, якую ідэнтыфікуюць як аўтарку беларускай паэмы *Мачаха*, па-першае, ніколі дагэтуль не была ў сталіцы Пястаў (гераіня пераносіцца туды сілаю свайго ўяўлення, у сне – „Zasnułam. A sen mój – jakby marzeń koniec // Przeniósł mnię do nieznanych Krakowa okolic"[8]*)*, а, па-другое, жыла на той момант даволі далёка ад Кракава, дзе здарыўся жахлівы пажар, пра які, як яна піша, і дайшла сюды, у глухі куток на Літве, вестка аб трагедыі. Гэтая вестка ўскалыхнула свядомасць, абудзіла ў душы спачуванне „далёкім братам" і выклікала ва ўяўленні ўсё тое фантасмагарычнае відовішча, якое затым апісваецца ў вершы.

Ізноў бачым выразныя супадзенні з лёсам Габрыэлі, якая, сапраўды, упершыню пабывае ў Кракаве толькі ў 1857 г. Яшчэ адно красамоўнае супадзенне ўбачылася нам у дадзеным тэксце пры згадцы капліцы. Трапіўшы ва ўяўленні ў Кракаў, лірычная гераіня прамінае пышныя кракаўскія касцёлы і замак, адзначаючы іх веліч, скіраванасць у нябёсы, але галоўнае містычнае дзеянне ў вершы адбываецца менавіта ў „пекнай капліцы", дзе яна бачыць кабету, што кленчыць і моліцца. Культурны кантэкст адразу прымушае прыгадаць дабраўлянскуюя капліцу, з адбудовы якой пачаў рэстаўрацыю набытага палаца граф Адам Гюнтэр, бацька Габрыэлі. У капліцы адбываліся хатнія набажэнствы, яна была сімвалам духоўнасці Дабраўлянаў і іх жыхароў, пра яе неаднойчы згадвала аўтарка ў сваіх успамінах. Менавіта гэтую блізкую рэалію магло намаляваць уяўленне паэткі, якая ніколі да таго не бывала ў кракаўскіх касцёлах.

Між іншым, да гэтага часу недалёка ад месца, дзе стаяў калісьці велічны дабраўлянскі палац, месціцца сціплая каплічка, прыстасаваная і сёння для набажэнстваў, якая, магчыма, і стала правобразам капліцы, згаданай у вершы *Кракаў*. Ключ ад яе дзвярэй, які мы мелі нагоду трымаць у сваіх руках пад час палявых доследаў Дабраўлянаў, мае такі старадаўні выгляд, што не выклікае сумнення ў існаванні

[7] I. Bahdanowicz, *Pytannie autarstwa paemy „Maczacha"*, [u:] *Nowaje słowa u litaraturaznaustwie i falkłarystycy,* red. I. Bahdanowicz, Minsk 2012, s. 260–267.

[8] Rkp., BJ, 4597, III, k. 4.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

гэтай капліцы ў XIX ст., магчыма, у больш прэзентабельным выглядзе (бачна, што быў перабудаваны разбураны дах і абноўлена ўнутранае ўбранне, але сцены знутры і звонку маюць аўтэнтычны выгляд).

Такім чынам, на другім этапе нашага даследавання, дзякуючы непасрэднаму азнаямленню з канвалютам, што змяшчае рукапісы абодвух твораў, мы змаглі ўдакладніць некаторыя палажэнні, якія дазваляюць атрыбутаваць аўтарства паэмы *Мачаха* Габрыэлі з Гюнтэраў Пузыні, што дадаткова падцвярджалі некаторыя дэталі з польскамоўнага верша *Кракаў*. Вынікам гэтага этапу даследавання можна лічыць і тое, што не знайшлося важкіх аргументаў супраць магчымага аўтарства Габрыэлі, якія б яўна супярэчылі вядомым гісторыка-культурным і біяграфічным фактам.

Даследаванне фальклорных прыёмаў

Намі было таксама праведзена спецыяльнае даследаванне фальклорных прыёмаў і сродкаў фальклорнай стылізацыі, ужытых у паэме *Мачаха*[9]. Яно сведчыла, што аўтарка выкарыстала: 1) прыём псіхалагічнага паралелізму, які структурна арганізоўвае ўвесь тэкст і абумоўлівае яго алегарычнасць; 2) адушаўленне прыродных стыхій, што спрыяе больш эмацыйнаму выражэнню патрыятычнай, змагарнай ідэі твора; 3) шчодрае ўжыванне памяншальна-ласкальных формаў слоў, калі гаворыцца пра роднасныя стыхіі, што ўзмацняе экспрэсіўнае ўздзеянне твора (*„праз рэчаньку", „у чоўніньку", „Нямночык", „барочык", „Літоўчык", „дубровачка", „Літовачка", „туманочкам ляцеў", „з беражочка ў беражочык"* і да т.п.); 4) інтэрпрэтацыю народна-песеннага матыву сіраты і злой мачахі, якая надае паэме асаблівую псіхалагічную глыбіню, узмацняе алегарычны план твора.

Ці супярэчылі гэтыя высновы нашай атрыбуцыі? Не, не супярэчылі. Чаму? Таму што Габрыэля ведала мясцовы фальклор, жыццё і звычаі сялян і актыўна выкарыстоўвала гэты досвед у сваёй творчасці, аб чым сведчаць яе балада *Зязюлька-кукулька. З паданняў літоўскага люду* і нізка празаічных мініяцюр *Слоўцы люду*. Да таго ж ёсць нямала іншых аргументаў на карысць нашай версіі. Гэта і тое, што Габрыэлі, як ужо падкрэслівалася, быў уласцівы яскравы „літвінскі" патрыятызм, і тое, што яна выкарыстоўвала нямала беларусізмаў у сваёй польскамоўнай творчасці, уважліва адносілася да мовы і жыцця простага люду. Будучы арыстакраткай-графіняй, яна цікавілася жыццём сялянства, прыглядалася да яго, была спагадлівая да людзей абяздоленых, умела знаходзіць у іх жыцці рысы пачцівасці і годнасці. Сама ж яна мела выразныя хрысціянска-гуманістычныя погляды, ставілася да ўласнай заможнасці і арыстакратычнага паходжання без пыхі і ганарлівасці.

[9] I. Bahdanowicz, *Pryjomy falkłornaj stylizacyji u paemie „Maczacha" Adeli z Ustroni*, [u:] *Falkłor i suczasnaja kultura,* cz. 1, red. I. Rouda i insz., Minsk 2011, s. 101–102.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

Часта ў яе творах сустракаліся вобразы дзіцяці-сіраты і мачахі, але, у адрозненне ад фальклора, былі пададзены па-іншаму. У яе літаратурных творах мачаха – добрая апякунка сірот, зычлівая, спагадлівая жанчына, якая шкадуе дзяцей і хоча ім дабра. Відаць, такой была б і сама Габрыэля, калі б лёс паставіў яе ў падобную сітуацыю. Знешне гэта пярэчыць адмоўнаму вобразу мачахі ў паэме Адэлі з Устроні, аднак не варта забываць, што фальклорны вобраз мае ўстойлівыя, нязменныя рысы, якія не можа ігнараваць аўтар пры звароце да фальклорных традыцый. Тым больш уся ідэйна-мастацкая задума паэмы, яе алегарычнасць вымагала менавіта вобраза злой мачахі, якая дратуе долю сіраты, узмацняе яе гора. Народна-песенная традыцыя была накіраваная не столькі на тое, каб абурацца жорсткасцю мачахі, колькі на тое, каб выклікаць у слухача яшчэ больш моцны жаль і спагаду да долі сіраты. Найперш праз такое спачуванне, а не праз абурэнне, выяўлялася міласэрная і гуманістычная скіраванасць народнай лірыкі беларусаў.

Застаецца зрабіць яшчэ два акцэнты ў нашай тэме. Першы датычыць псеўданіма Адэля з Устроні. Мусім звярнуць увагу на тое, што гэта вельмі ўдалы, але тым не менш штучна сканструяваны псеўданім. Рукапісны сшытак, у якім змешчана паэма, а менавіта другі тэкст у ім (польскамоўны верш *Кракаў*), быў падпісаны проста імем „Adela". У левым ніжнім кутку рукапісу маецца памета: „Litwa. 1850. Ustronie". З кантэкста верша і з семантыкі самога слова „ustronie" вынікае, што тут не абавязкова маецца на ўвазе канкрэтны тапонім – назва нейкай пэўнай вёскі ці фальварка на Лідчыне, блізу Нёмана. „Устроне" ў дадзеным кантэксце можа азначаць проста „аддалены, глухі куток", правінцыйнае зацішша, далёкае ад шумнай сталіцы, якой і быў ва ўспрыняцці аўтаркі Кракаў. Аб гэтым сведчыць менавіта само слова *„ustronie*", якому, напрыклад, у рускай мове сугучнае слова „*устраниться"* (адасобіцца). Такім чынам, адпадае патрэба шукаць таямнічую Адэлю ў канкрэтнай вёсцы з назваю Устронь (Устроне) у Лідскім павеце над Нёманам.

Другі акцэнт датычыць Нёмана – ракі, на якой адбываецца дзеянне ў паэме. Нёман у дадзеным выпадку таксама ёсць не столькі геаграфічнай, колькі міфапаэтычнай рэаліяй. На той момант у літаратурнай творчасці гэта быў ужо ўстойлівы патрыятычны вобраз-сімвал, увасабленне роднаснага, сакральнага ўяўлення пра Айчыну. Гэта была тая „радаводная рака", паводле санета Адама Міцкевіча *Да Нёмана*, з якой злівалася паняцце радзімы. Падобным чынам у беларускім фальклоры можна часта сустрэць згадку пра раку Дунай, геаграфічна досыць далёкую ад Беларусі. Тут праяўляліся, відавочна, надзвычай архаічныя пласты народных уяўленняў, захаваныя да нашага часу. Дунай у народнай творчасці „выступае як адухоўленая істота, да якой звяртаюцца за парадамі, з просьбамі, і разам з тым ствараецца ўражанне, што гэта любая з беларускіх рэчак-рачулак, якая ў вуснапаэтычных жанрах носіць славутую назву", – піша даследчык Аляксей Ненадавец[10]. Падобная ж фальклорная традыцыя адбілася і ў паэме *Мачаха*, дзе ролю „Дунаю" адыгрывае блізкая, родная рака Нёман.

[10] A. Nienadawiec, *Mifałahicznyja ujaulenni sławian ab wodnaj stychiji* [u:] *Mifałohija. Duchounyja wierszy,* Minsk 2003, s. 141.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

Актуальнасць новага падыходу

На сённяшні дзень новы этап дадзенага даследавання, прысвечанага атрыбуцыі паэмы *Мачаха*, скіроўвае нас да больш уважлівага знаёмства з вобразнымі і метрычнымі асаблівасцямі верша *Кракаў* і параўнання іх, а таксама паэмы *Мачаха*, з іншымі вершамі Габрыэлі Пузыні[11]. Ці існуе падабенства мастацкай стылістыкі тэкстаў, якія несумненна належаць пяру Габрыэлі, і якія, паводле нашай гіпотэзы, могуць імі быць? Пошук адказу на гэта пытанне ўласна складае цяпер нашу задачу. Ключом для разважанняў і для разгадкі аўтарства паэмы *Мачаха*, на што мы ўжо не раз звярталі ўвагу, застаецца польскамоўны верш *Кракаў*.

Змест і вобразы гэтага верша, яго рэлігійна-містычная ўзнёсласць, матыўная прастора вельмі натуральна карэлююць з мастацкім светам многіх вядомых вершаў Габрыэлі Пузыні, апублікаваных у некалькіх прыжыццёвых яе зборніках, а менавіта: *У імя Божае* (1843) і *Далей у свет* (1845), а таксама *Dzieci Litewskie: ich słówka, odpowiedzi i postrzeżenia* (2-е выд., 1856). Асаблівым чынам нас будзе цікавіць гэты апошні зборнічак, прысвечаны дзецям, дзіцячаму ўспрыняццю свету, які добра ведала і адчувала Габрыэля, хоць сама яна не мела ўласных дзяцей. Тым не менш свет дзіцячых уяўленняў быў блізкі ёй, яна была вельмі назіральная і ўмела ператварыць у верш найменшае жыццёвае здарэнне, сітуацыю, сказанае слова. Яны пад яе пяром ператвараліся ў дзівосны свет дзяцінства, гарманізавалі з рэлігійным хрысціянскім выхаваннем, былі напоўнены сапраўднымі глыбокімі пачуццямі спагады і любові да бліжняга ў хрысціянскім духу, разуменнем дзіцячай душы, часта давалі праўдзівы досвед належнага выхавання, прыклад паводзінаў дзіцяці, свядомасць якога чыстая, а душа празрыстая, даверaная Богу. Асаблівую спагаду ў яе выклікалі дзеці-сіроты.

Звярнуць увагу менавіта на „дзіцячую" тэму нас прымушае тое, што ў вершы *Кракаў* мы сустракаем характэрны вобраз дзіцяці – маленькага хлопчыка, які ў мітусьні ратавання ад пажару згубіў сваю маці, быў як хворы ў гарачцы, плакаў, блукаючы па вуліцах горада, пакуль не сустрэў тую, што ў постаці заснулай лірычнай гераіні перанеслася ва ўяўленні на кракаўскае пажарышча. Узяўшы гэтага спакутаванага хлопчыка за руку, яна разам з ім шукае яго матулю, затым бачыць у расчыненай „пекнай капліцы" кленчачую кабету. Так сын і маці ў містычны спосаб знаходзяць адзін аднога, а наша гераіня вяртаецца да прытомнасці і зноў аказваецца ў далёкім ад Кракава кутку – у родным „зацішку" ў Літве (на „устроне"). Такім чынам, тэма дзіцяці, якое пакутуе, застаўшыся без маці, якое чуецца неабароненым, няшчасным, выклікае спачуванне, – гэтая тэма неаднаразова гучыць у паэзіі Пузыні і з'яўляецца, можна сказаць, яе візітнай карткай. Таксама як

[11] Трэба зазначыць, што склалася ўжо пэўная традыцыя называць твор *Мачаха* паэмай, а *Кракаў* – вершам, хаця розніца ў іх працягласці невялікая: паэма *Мачаха* налічвае 110 радкоў, а верш *Кракаў* – 90. Мы будзем і далей прытрымлівацца традыцыйных жанравых вызначэнняў. – І.Б.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

і рэлігійны хрысціянскі характар усёй яе творчасці, у якой амаль заўсёды прысутнічае містычны звышнатуральны досвед глыбока рэлігійнага чалавека, які зямное рэальнае жыццё суадносіць з Божым провідам і ніколі не забываецца, што зямны шлях ёсць толькі пралогам да шляху нябёснага.

Верш ***Кракаў***

Звернемся да паслядоўнага змястоўна-вобразнага аналізу верша *Кракаў*, які складаецца з 90 радкоў і мае пэўную сюжэтна-кампазіцыйную структураванасць. Яго зачын, або экспазіцыя, прысвечаны атрыманню жахлівай весткі пра пажар і эмацыйнай рэакцыі на яе: (w polskich tekstach zachowano oryginalną pisownię)

> Gdy wieść okropna Krakowa pożaru
> Doszła cichego litewskiego jaru
> I gdy wokoło pośpiesznie krążyła
> Boleśnie serca nasze uderzyła.
> Bo Krakow starożytny zdaleka, zza świata
> Budził w sercach uczucia dalekiego Brata!…
> I kołatał do duszy o bratnie wspomnenie!
> Obrazkami poezyi, wprawiał w zachwycenie…[12]

Далей выказваецца захапленне захаванымі традыцыямі даўняй культуры („ад Айцоў”): народнымі танцамі, уборамі, магчымасцю свабодна, „даючы руку брату”, спяваць і ўсміхацца свету (тут можна заўважыць алегарычны намёк на тагачасную грамадска-палітычную сітуацыю ў „зацішным кутку” на Літве – на несвабоду і адсутнасць такіх магчымасцяў пры чужым „заборы” краю) і жаданне самой калі-небудзь у жыцці так „забавіцца хвількай” (то бок свабодным самавыяўленнем у формах традыцыйнай роднай культуры). „Але тое мары! Ах, чаму ж марамі расчульваем нашы сэрцы…”, – ускліквае аўтарка, нібы наракаючы, што рэчаіснасць прымушае „гнаць заўсёды ідэалы”, якія, здаецца „забралі душу”. Завяршае экспазіцыю верша выснова ў рэлігійным духу: „Im większa na tym świecie żałośliwa troska // Tem silniejsza moc duszy! – Ta nadzieja Boska!”[13]

Аўтарка заклікае не паддавацца слабасці, роспачы, сумненням, а ўзмацняць сілы, хоць „tak cierpka droga”… У такім роздуме лірычная гераіня засынае і пераносіцца ў „нязнаныя” ваколіцы Кракава. Усё тут выглядае для яе незвычайна, і, нягледзячы на вынікі пажару, чаруе красой: свеціць ясны велічны месяц у блакітах, паглядае на „wspaniały” Кракаў, закідвае срэбныя промні і купае іх ва „uroczej” Вісле, мільёны зорак у цішыні чуваюць над заснуўшым светам. Гераіня ідзе ў горад – бачыць па дарозе „tłum wieży”, кожная з якіх, здаецца, „w Niebo bieży”… Праходзіць праз „пекную спакойную вуліцу”, у яе дрыжыць сэрца, калі яна глядзіць на „даўнюю сталіцу”, і зрок затуляе сляза. Падыходзячы да велічна-

[12] Rkp., BJ, 4597, III, k. 3.
[13] *Ibid*., k. 3v.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

га кургана, адчувае асаблівае трымценне душы, у яе падгінаюцца калені, цякуць слёзы, узрушэнне, якое перажывае, хоча выбухнуць з расчуленага сэрца песняй… Гэтае містычнае трызненне перапыняе сустрэча з хлопчыкам: „I nie wiem jakbym długo klęczała wzachwycie // Gdyby mi nie przerwało jakieś małe dziecie!" („І не ведаю, як бы доўга кленчыла ў захапленні, // Калі б мяне не перапыніла нейкае малое дзіця!")[14].

З гэтага моманту распачынаецца асноўная сюжэтная частка твора: сустрэча і знаёмства з дзіцем, вандроўка з ім па горадзе ў пошуку маці, знаходжанне капліцы з кабетай, якая моліцца. Фінал твора ўрачыста адзначаны сустрэчай маці і сына, а таксама вяртаннем да прытомнасці гераіні, якая прачынаецца „ў заціш-ным кутку".

Важная ўвага надаецца аўтаркай апісанню выгляду дзіцяці:
Twarzyczka błada! A oczki splakane
I ręczki z dziwnym żalem załamane!…
Sukienka czarna! Jak całun żałoby
Z białym sznurkiem wokoło! Dla strasznej ozdoby!…
A niewinne usteczka! Spalone rozpaczą
A oczki! Zdaję sie łzami wszystkiemi już płaczą…[15]

Хлопчык запытвае ў яе, ці не бачыла яна яго маці? „Я зараз памру! Божанька, за што Ты мяне караеш!" – ускліквае пабожнае спалоханае дзіця. „Што з табой, мой анёлку, у такі позні час?" – пытаецца гераіня і даведваецца, што ў час пажару хлопчык згубіў маці, якая вынесла яго з палаючага дома і вярнулася за яго сястрой. Аўтарка робіць ізноў містычнае адступленне ў засветнае: пры яе сустрэчы з хлопчыкам бліснула „ютранка" як Божы знак, які падала анёльская рука „для нас, зямных тулягаў". Плачучы, хлопчык скардзіцца: „Ach! …gdzie… moja Mamulka mnie tak noźki… bolą…// ***I serduszko tak boli***!… zdajesię jego kolą…"[16]

Узяўшы малога за руку, гераіня „Poznałam że chłopczyna ***miał z płacza goręczka***"[17].

Тут мы мусім адысці ад сюжэтнай лініі верша і звярнуць увагу на тое, што прыведзеныя ў цытатах словы і выразы, вылучаныя намі тлустым курсівам, сустракаюцца неаднойчы ў дзіцячай паэзіі Габрыэлі Пузыні. Напрыклад, верш *Pierwsze kłamstwo*: „Jaś sam pada na kolana // ***I rączki z żalu załamał***, // Woła, twarz łzami zalana: «Boże pilnuj bym nie kłamał!»"[18]. Верш *Wiara* пра хворага хлопчыка Стася васьмі гадоў, якога маці асцерагаецца браць у паездку: „Pali mu główka

[14] *Ibid*., k. 4.
[15] *Ibid*., k. 4v.
[16] *Ibidem*.
[17] *Ibid*., k. 5.
[18] *Dzieci Litewskie, ich słówka, odpowiedzi i postrzeżenia*, Wilno 1856, s. 56.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

i ***ręczki*** // Droga nie ujmie, lecz doda // Do bolu i ***do gorączki***"[19]. У вершы пра двухгадовага Казю сустракаем выраз: „Oby ***serduszka*** nie zmienił"[20]. Верш *Sierotka* прысвечаны 6-гадовай Стэфці, у якой поўна цацак і золата ў доме: „Ale Stefcia bardzo biedna, // Bo ***serduszko*** jej w żałobie, // Bo jej Mama łeży w grobie!" (с. 104)[21]. Верш *Władyś M... Lat 10*: „Władysia serce, to ***serduszko*** złote" (с. 113)[22]. І нарэшце, верш *Chleb Jasia. Lat 4*: „Jaś w ***serduszku*** litość czuje" (с. 117)[23]. Прыведзеныя прыклады, на нашу думку, красамоўна сведчаць пра спецыфіку ўжывання падобных слоў і выразаў у вершы *Кракаў* і ў аўтарскіх вершах Г. Пузыні, паказваючы на відавочнае супадзенне „аўтарскай рукі" у саміх спосабах карыстання словамі ў пэўным кантэксце.

Завяршаючы апісанне сюжэтнай лініі, падкрэслім наступнае. Гераіня з хлопчыкам крочаць па вуліцы, бачаць адчыненыя дзверы „пекнай капліцы" і „… przed ołtarzem postać kobiety kłęcząca // Z ramion wgórę wzniesionych – znać że błagająca // I rzekłbyś że już do Stwórcy leciała! // Ostatkiem sil nadziemskich Litości błagała!…".[24] Апісваючы кабету, аўтарка звяртае ўвагу на яе трансцэндэнтны малітоўны стан, асаблівы ўздых, якім яна нібы ўсю роспач выштурхоўвала з сэрца, у выніку чаго знішчыліся заслоны і здарыўся цуд: „Dziecie wbiegło!… kobieta klęczącią zwrociła // Synu!!!…krzyknięła – k Dziecku się rzuciła // O Mamo!!… Mamo!!… dziecie wykrzyknęło // I szczęsliwe w objęciach Matki utonęło"[25]. Далей апісваецца ўрачыстае рэха радасці, якое адбіваецца хорамі ў капліцы і якім гучыць тут усё: алтары, калоны, абразы, арганы і нават падземныя труны… Гэта анёльскія галасы ў захапленні, здаецца, усю капліцу ўзносяць у Нябёсы і прыліваюць кроў да сэрца гераіні, якая: „Zemdlałam!… I w Ustroniu cichym się ocknęła"[26].

Узвышаны рэлігійны фінал верша таксама адпавядаў рэлігійнай настроенасці ўсёй паэтычнай творчасці Габрыэлі Пузыні, якую Уладзіслаў Сыракомля назваў „святаркай нашай зямлі". Яе рэлігійныя вершы (асабліва са зборніка *У імя Божае*) таксама часам называлі „кантычкай" або „катэхізісам" для дзяцей і дарослых, бо яна шмат распавядала пра цноты і дабрачыннасці, паэтызавала малітоўны стан душы, часта ў яе вершах гучалі матывы спалучанасці нябёснага і зямнога, вечнага і часовага.

[19] *Ibid*., s. 84.
[20] *Ibid*., s. 90.
[21] *Ibid*., s. 104.
[22] *Ibid*., s. 113.
[23] *Ibid*., s. 117.
[24] Rkp., BJ, 4597, III, k. 5.
[25] *Ibid*., k. 5–5v.
[26] *Ibid*., k. 5v.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

Звесткі пра кракаўскі пажар

Калі з высокай ноты зноў звярнуцца да тагачаснай рэчаіснасці, то варта яшчэ згадаць, што крыніцай вестак пра кракаўскі пажар, відавочна, для аўтаркі твора паслужыла тагачасная афіцыйная ўрадавая газета „Kuryer Wilenski=Виленскій Вестникъ". Яна выходзіла паралельна на рускай і польскай мовах, і яе, хутчэй за ўсё, выпісвала і чытала мясцовае адукаванае таварыства, каб быць у курсе бягучай інфармацыі. У ліпені – пачатку жніўня 1850 г. у гэтай газеце змяшчаліся „гарачыя" весткі пра кракаўскі пажар. Так, у № 58 за 28 ліпеня 1850 г. газета, з адсылкай да кракаўскай газеты „Czas" за 21 чэрвеня, пісала, што пажар, які пачаўся 18 ліпеня, моцны вецер разнёс па ўсім горадзе, і ён бесперапынна бушаваў пяць дзён, на працягу 18 – 21 ліпеня. Паведамлялася, між іншым, наступнае (падаем у расійскамоўнай версіі, паводле якой можна адчуць тымчасовыя мясцовыя асаблівасці рэтрансляцыі падзей, звязаныя з „заборам" краю): „Сегодня, для собирания добровольных приношений в пользу погоревших города Кракова, и за тем для распределения поступивших пожертвований, местное правительственное управление открыло «комитетъ краковских погоревших», под председательством графини Потоцкой. Краковская главная консистория издала вчера распоряжение, чтобы епархиальное духовенство совершило во всех церквях благодарственное молебствие, за предотвращение бедствия, угрожавшего гибелью нашему городу, а также за ниспосланное наказание, принятое с благоговением и смирением, за грехи наши. Вместе с сим предписано духовенству поощрять верных во Христе к оказанию вспомоществования стольким жертвам бедствия, оставшимся без крова и хлеба, пользуясь столь обильным урожаем полей, в духе христианского милосердия. Монахи Доминиканцы сегодняшнее воскресное молебствие совершили в одном из притворов сгоревшей церкви. 19-го числа, в 3 часу пополудни, в минуту когда самый сильный пожаръ бушевал в северной части базара, обхватывая вместе домы базара съ западной стороны, и в то же время угрожал, в совокупности с пылавшею уже Столярною улицею, ближайшим домам, расположенным при Богородицкой церкви, священник Жловодский вышел из церкви со святыми дарами в руках и, окруженный толпою народа, остановился на углу Сенной улицы и, упав на колени, начал петь: «Под кров Твой притекаем, Господи!». Это зрелище было невыразимо: там жители, спасающие от пламени скудные свои пожитки; далее войска под ружьем в горестном безмолвии; здесь народ благоговеющий пред Богом силъ и умоляющий о помиловании остатков злополучного града. И Бог услышал мольбы: пожар в этом направлении не распространился дальше. По обнародованному официальному показанию, 18 числа сгорело всего сто пятьдесят один дом и четыре церкви: св. Троицы (Доминиканцев), св. Франциска (Францисканцев), св. Иосифа (монахинь Францисканскаго ордена) и св. Норберта (Греко-Униатская)"[27].

[27] „Kuryer Wilenski=Виленскій Вестникъ", 28 lipca 1850.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

У № 59 ад 1 жніўня 1850 г. газета „Kuryer Wilenski=Виленскій Вестникъ”, пераказваючы падзеі 22 ліпеня ў Кракаве, пісала аб тым, што „мінулі ўжо страшныя дні трывогі”, што дзень прайшоў спакойна і пажары нідзе болей не ўзнікалі. Аднак затым паведамлялася, што 25 і 27 ліпеня ізноў успыхнулі пажары ў шматлікіх дамах, якія былі неўзабаве пагашаныя, Але пажар у біскупскім палацы доўга не ўдавалася пагасіць.

На нашу думку, менавіта інфармацыя пра кракаўскі пажар, змешчаная ў газеце „Kuryer Wilenski=Виленскій Вестникъ”, паслужыла крыніцай звестак і штуршком для напісання верша *Кракаў* Адэляй з Устроні.

Падсумаванне

Такім чынам, падвядзенне вынікаў нашых разважанняў, дазваляе паставіць наступнае пытанне: ці пераконвае нас аналіз верша *Кракаў* у тым, што яго аўтаркай можа быць Габрыэля Пузыня? На нашу думку, бясспрэчна, пераконвае, і гэта звязана з самім характарам ужывання падобных моўных сродкаў, якія ствараюць падобны эмацыйны эфект. Яшчэ больш дапаўняе гэтую ўпэўненасць характар метрычнай сістэмы паэмы *Мачаха* і верша *Кракаў*. Метрычная сістэма гэтых твораў мае выразнае падабенства са шматлікімі вершамі Габрыэлі Пузыні, гэтак жа як сумежны характар рыфмоўкі, уласцівы абодвум творам, мае месца і ва ўласных творах Пузыні. Супадзенне ж метрычнай сістэмы проста ашаламляе!

Паэма *Мачаха* і верш *Кракаў* напісаны акцэнтна-складовым вершам. Паводле *Паэтычнага слоўніка* Вячаслава Рагойшы, спецыфіка такога віду танічнага верша ў тым, што апрача аднолькай колькасці акцэнтаў (моцных націскаў) ён мае аднолькавую колькасць складоў у вершаваных радках. Такі верш паядноўвае асноўныя прыкметы сілабічнага вершавання і народнага верша, ён быў характэрны для беларускай паэзіі XIX ст. Часам, як заўважае В. Рагойша, колькасць націскаў і колькасць складоў можа неістотна мяняцца[28].

У дачыненні да разглядаемых намі твораў можна сказаць наступнае: паэма *Мачаха* напісана 2-акцэнтным 8-складовікам (часам 3-акцэнтным, прычым месца націску зменлівае), а верш *Кракаў* мае рухомую метрычную характарыстыку, у якой пераважаюць 4-акцэнтныя 11-складовік і 13-складовік з нязначнымі адхіленнямі. У зборніку Габрыэлі Пузыні *Dzieci Litewskie, ich słówka, odpowiedzi i postrzeżenia…,* як намі падлічана, з 54 вершаваных твораў 40 напісаны менавіта 2-акцэнтным 8-складовікам і толькі 14 маюць іншыя метрычныя формы, сярод якіх сустракаецца і 4-акцэнтны 11-складовік (напрыклад, цытаваны верш пра Ўладыся). У іншых зборніках паэткі таксама досыць шырока прысутнічае 2-акцэнтны 8-складовік (напрыклад, вершы *Алелюя, Песня рольніка, Зося ў Друскеніках, Мазурачкі Стасі, Памяць Зосі, Ад імя сялян: просьба пра новыя мо-*

[28] W. Rahojsza, *Paetyczny słounik,* Minsk 2004, s. 185.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

гілкі, Віншаванне чаляднікаў на імяніны іх пана, Зязюлька-кукулька). Як можна заўважыць, выкарыстанне такой метрычнай сістэмы абумоўлена тэматыкай, звязанай з жыццём сялян або дзяцей, а таксама ўплывам песеннай народнай традыцыі (напрыклад, духоўны спеў на Вялікдзень, народная балада).

Такім чынам, параўнанне мастацка-вобразных сродкаў верша *Кракаў* з вершамі Габрыэлі Пузыні, прысвечанымі дзецям, дазваляе сцвярджаць, што іх пісала адна і тая ж рука, а гэта значыць, што аўтарства верша *Кракаў*, падпісанага псеўданімам Адэля з Устроні, несумненна, належыць менавіта Габрыэлі Пузыні. Гэтым яшчэ раз падцвярджаецца высунутая намі раней гіпотэза, што Габрыэля Пузыня з'яўляецца і аўтаркай беларускай паэмы *Мачаха*. Калі ж сумнявацца ў апошнім і меркаваць, што творы *Кракаў* і *Мачаха* напісаны рознымі аўтарамі, то сама метрычная сістэма *Мачахі*, якая цалкам адпавядае характару метрыкі вершаў Г. Пузыні, адкідвае ўсякія сумненні. Такім чынам, мы прывялі дастаткова шмат новых аргументаў, каб атрыбутаваць псеўданім Адэля з Устроні, а таксама аўтарства паэмы *Мачаха* і верша *Кракаў* Габрыэлі з Гюнтэраў Пузыні. Наш артыкул прысвячаем 200-годдзю з дня нараджэння гэтай выбітнай пісьменніцы нашага краю.

Бібліяграфія

Bahdanowicz Iryna, *Adela ci Gabryela: sproba razhadki autarstwa paemy* „*Maczacha*”, „Rodnaje słowa” 2007, 10, s. 14–18.

Bahdanowicz Iryna, *Pryjomy falkłornaj stylizacyji u paemie* „*Maczacha*” *Adeli z Ustroni*, [u:] *Falkłor i suczasnaja kultura*, cz. 1, red. Iwan Rouda i insz., Minsk: BDU, 2011, s. 101–102.

Bahdanowicz Iryna, *Pytannie autarstwa paeny Maczacha*, [u:] *Nowaje słowa u litaraturaznaustwie i falkłarystycy*; „Biełarusika=Albaruthenika*”* 31, red. I. Bahdanowicz, Minsk: Czetyre czetwierti, 2012, s. 260–267

Bahdanowicz Iryna, *Zahadka Adeli z Ustroni*, *Pracy Kafiedry historyji biełaruskaje litaratury Biełdziarżuniwersiteta 7*, Minsk: Prawa i ekanomika, 2006, s. 52–62.

Kraju moj *– Nioman. Grodzieńszczyna litaraturnaja*, red. Danuta Biczel-Zahnietawa, Minsk: Mastackaja litaratura 1986.

„**Kuryer Wilenski** = Виленскій Вестникъ” 28 lipca – 1 sierpnia 1850. Rękopis, Biblioteka Jagiellońska, 4597, III.

Łojka Aleh, **Rahojsza Wiaczasłau**, *Biełaruskaja litaratura XIX stahoddzia:* Chrestamatyja, Minsk: Wyszejszaja aswieta, 1988.

Maldzis Adam, *Try miesiacy poszukau, znachodak i sustrecz*, „Połymia” 1973, 7, s. 202–240.

Maldzis Adam, *Zahadka adnago rukapisnaha twora,* „Hołas Radzimy”, 16 wierasnia 2010.

Rasa niabiosau na ziamli tutejszaj*: Biełaruskaja polskamounaja paezija XIX stahoddzia*, red. Uładzimir Marchel, Minsk: Drukarnia imia J. Kołasa, 1998.

Nienadawiec Alaksiej, *Mifałahicznyja ujaulenni sławian ab wodnaj stychiji*, [u:] *Mifałohija. Duchounyja wierszy*, Minsk: Biełaruskaja nawuka, 2003.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:47:39

Puzynina Gabriel, *Dzieci Litewskie, ich słówka, odpowiedzi i postrzeżenia*. *Z prawdziwych wydarzeń zebrała Autorka w Imię Boże, Edycja druga poprawna i pomnożona 17 powiastkami,* Wilno 1856.

Rahojsza Wiaczasłau, *Paetyczny słounik*, Minsk: Wyszejszaja aswieta, 2004.

Streszczenie

Artykuł prezentuje pionierską analizę literaturoznawczą środków wyrazu artystycznego i obrazowania poetyckiego wiersza *Kraków*, którego rękopis datowany na 1850 rok, podpisany pseudonimem *Adela*, został odnaleziony w jednej obwolucie z rękopisem znanego, anonimowego poematu *Macocha*. Środki artystyczne wiersza *Kraków*, a także poematu *Macocha* potwierdzają tezę, że autorem obu utworów jest znana w owym czasie pisarka, Gabriela Puzynina (1815–1869).

Słowa kluczowe: Adela z Ustronia, poemat *Macocha*, wiersz *Kraków*, Gabriela Puzynina, atrybucja, pseudonim, białoruska poezja polskojęzyczna, poezja XIX wieku

Рэзюме

У артыкуле ўпершыню праводзіцца літаратуразнаўчы аналіз вобразнай спецыфікі і сродкаў паэтычнага майстэрства верша *Krakow*, рукапіс якога быў падпісаны псеўданімам Адэля, датаваны 1850 годам і змяшчаўся ў адным канвалюце з рукапісам вядомай ананімнай беларускай паэмы *Мачаха*. Характар мастацкіх сродкаў, выкарыстаных у вершы *Кракаў*, дазваляе меркаваць, што яго аўтарам з’яўляецца вядомая на той час пісьменніца Габрыэля Пузыня (1815–1869). Такая акалічнасць дадаткова абгрунтоўвае высунутае раней аўтарам дадзенага артыкула сцверджанне, што Г. Пузыня – найбольш верагодная аўтарка беларускай паэмы *Мачаха*.

Ключавыя словы: Адэля з Устроні, паэма *Мачаха*, верш *Кракаў*, Габрыэля Пузыня, атрыбуцыя, псеўданім, беларуская польскамоўная паэзія, паэзія XIX стагоддзя.

Summary

This article is the first literary analysis which shapes the specifics and means of poetics in the poem *Krakow.* The manuscript, in which the author used the pseudonym Adel, dates back to 1850. It was placed in the famous manuscript along with the well-known Belarusian anonymous poem *Stepmom*. The nature of artistic means used in the poem *Krakow*, suggests, that the real author of this work is the well-known writer Gabriel Puzynya (1815 – 1869). This conclusion confirms the author’s earlier statement that G. Puzynya is the most likely the author of the Belarusian poem *Stepmom*.

Key words: Adel of Ustron, the poem *Stepmom*, the poem *Krakow*, Gabriel Puzynya, attribution, pseudonym, Belarusian poetry in Polish, poetry of the XIXth century